ВЫСОКІ ПОЎДЗЕНЬ

1

Свішча вецер, балючы і хвосткі, як бізун, працінае да самых касцей. І няма ад яго паратунку: вакол заснежанае поле — голае, як далонь. З раскудлачаных хмар, што з крупадзёркі, густа сыплецца снежная жарства; вецер гоніць яе з пагоркаў, трамбуе ў лагчынах і кюветах, узнімае сумётамі на дарогах.

Ступіш крок-другі і спыняешся — цяжка дыхаць.

І гэта ў сакавіку — вясеннім месяцы. Нядаўнюю адлігу нечакана змянілі халады. З густымі завеямі і сцюдзёнымі вятрамі. Пра такое надвор'е звычайна гавораць: «Няйначай, як недзе чорт на ведзьме жэніцца».

А ў вёсцы самы ацёл, першая — каб толькі апошняя! — бяскорміца. Хіба ж усядзіш у цёплым кабінеце земаддзела, калі ты адзіны на раён ветэрынарны ўрач, калі ў толькі што арганізаваных калгасах няма аніводнага спецыяліста!

Свішча вецер. Растуць на дарогах сумёты. Бездараж. А чалавек ідзе. Жанчына. Крок упарты, на-

стойлівы. Ззаду асталіся Агарэвічы, Шашкі, Вялікія Круговічы, ціхія палескія вёскі. Яшчэ залетась тут грымела вайна.

Ваеннае ліхалецце няшчадна выплюхнула плынь вясковага побыту з яго спрадвечнага рэчышча. Некалі людныя дарогі апусцелі, гаваркія вёскі прыціхлі, нават звычайная пераклічка пеўняў — цяпер гэта як нейкі цуд.

А вецер аж захліпваецца, так скугоча, так каламуціць, што ні свету, ні следу не відаць. Жанчына спыняецца, адубелымі рукамі здзірае льдзінкі з цяжкіх веек, хукае ў далоні. «Ад гэтай повараткі да нас кіламетра паўтара з гакам,— успамінае яна словы Змітрака Глеба, дзяніскавіцкага старшыні.— Ды яшчэ кіламетры два гаку таго набярэцца...» І крочыць далей, адмервае нагамі кіламетры. Добра, што дарогу пытаць не трэба. За адзін год вымерала яе ва ўсіх кірунках ад вёскі да вёскі, ад хутара да хутара, ад фермы да фермы. І калі ўжо сабралася ў дарогу, наважылася ісці, хоць тут каменне сыпся з неба — пойдзе.

Са снежнай каламуці паказалася вёска. Праз колькі хвілін жанчына стомлена ўзнімалася на высокі ганак. Насустрач ёй расчыніліся дзверы, і шчупленькі мужчына — гэта быў Змітрок Глеб — раскінуў у бакі доўгія, як вёслы, рукі:

— Таварыш Сідоранка! Феня Мікалаеўна! Даруй мне, старому. Гэта ж, разумееце, даяркі напалохалі. Ну, я тут жа на пошту, да тэлефона. А яно ўсё добра абышлося — расцялілася карова... Чаго ж мы стаімо? Заходзьце ў хату.

Яна трошкі спазнілася і ад таго на сэрцы ніякавата. А як хацелася паспець, дапамагчы, супакоіць людзей, паменшыць іх хваляванні. Ужо ў хаце спытала старшыню:

— А як з кармамі, Змітро Трафімавіч?

— Бяда, Мікалаеўна. На пару тыдняў, не болей.
— І што будзем рабіць?
— Давайце разам падумаем.

2

Колькі перадумана за першыя пасляваенныя гады! На ўсё быў улік: на ворыўныя землі — іх было тады ў першых чатырох калгасах Ганцавіцкага раёна нямногім больш за тысячу гектараў; на жывёліну — яна ўлічвалася дзесяткамі галоў на грамадскіх фермах; на машыны — шчыра кажучы, іх зусім не было. Адсутнічаў улік толькі на думкі. А іх было многа, вельмі многа. І розных — слушных, памяркоўных, заўчасных. Але найбольш за ўсё вясёлых. Іх так і называлі: думкі-весялушкі. Нават прыпеўкі пра іх спявалі:

Ай, мае ж вы думкі,
Думкі-весялушкі,
Заспявалі ў сэрцы,
Бы ў дуброве птушкі.
Бы ў дуброве птушкі
Ды вясною ранняй.
І не моўкне спеў той
З ранку да змяркання.

Неяк, вяртаючыся са Свяціцы, што за сорак кіламетраў ад райцэнтра, Феня Мікалаеўна ўсю дарогу думала над прапановамі Адама Дзмітравіча Дрэня, агарэвіцкага старшыні калгаса. Былы партызан, рашучы і вёрткі, як вавёрка, ён ніколі не ведаў спакою, назаляў сваімі прапановамі ўсім — райкому, райвыканкому, спецыялістам раённага зямельнага аддзела. Апошняя прапанова старшыні прыйшлася даспадобы старшаму ветурачу земаддзела, захапіла яе настолькі, што Феня Мікалаеўна ўжо амаль нічога не чула і не бачыла перад сабой. Ішла шпарка, подбегам, па-

куль за Боркамі шуснулася ў нейкую яму. Ледзьве выбралася яна тады з халоднай балотнай калатушы.

Дома муж Фені Мікалаеўны Васіль Пятровіч Старавойтаў, інспектар райана, пытаўся:

— Як жа гэта ты, га? Ноч жа месячная была...

— Задумалася, Вася... Мае рацыю Дрэнь: пад ляжачы камень вада не пабяжыць. Трэба нешта рабіць. І чым хутчэй, тым лепш.

Яна першай благаславіла і праводзіла ў дарогу Адама Дрэня. Разам з жонкай старшыні, маладзенькай чарнакосай Нінай Дзмітраўнай, яна стаяла ля таварняка і думала: «Хоць бы табе, Адамка, спадарожнічала ўдача».

І сёння ніхто дакладна не ведае, як, на якой мове дамовіўся былы партызан са сваімі ўкраінскімі сябрамі. Усё ж праз тыдзень часу на патрапаным газагенератары нейкага леспрамгаса ён прывёз у калгас з дзесятак цялушак. Няхай сабе мясцовай пароды, але ж дамовіўся, прывёз.

А колькі было перадумана над тым, дзе і як размясціць грамадскі статак! У многіх вёсках — Чудзіне, Макаве, Свяціцы — не засталося не толькі даху над галавой, а нават шула, да якога можна было б прывязаць жывёлу. Перш-наперш будавалі жыллё для людзей. Але ж праўду кажуць у народзе: «Як дом без сяней — не дом, так без жывёлы гаспадарка — адно тлум і сварка».

Будоўлі — спрадвечная радасць людская. Пасля вайны ім радаваліся ўдвая больш. Калі будуецца дом, аб жыцці думае чалавек, а ўзводзіцца хлеў ці іншая пабудова для жывёлы — аб дастатку мараць людзі.

Першымі пачалі будавацца чудзінцы. Радаваліся кожнаму вянку на свежых зрубах, кожнай новай пабудове. Феня Мікалаеўна прыйшла з Чудзіна якраз у той дзень, калі вяскоўцы падбіралі месца для жывёлагадоўчай фермы. Раіліся, жартавалі.

— Мо пачакаем з гэтай самай фермай? — нясмела перашэптваліся старэйшыя калгаснікі.— Не гарыць жа...

— Можа надвое варожа,— пярэчылі маладзейшыя.

— А навошта спяшацца? Паспяшыш — людзей насмяшыш.

— Нічога: раней устанеш — болей зробіш.

— Ну, то паробім катухі. Абжывёмся крыху, а там пабачым...

Старшыня чудзінскага калгаса Мікалай Цімафеевіч Пятрэня, таксама былы партызан, разважлівы і на рэдкасць ашчадны чалавек, моўчкі слухаў гаворку калгаснікаў і дыміў самакруткай.

— Што вы скажаце на іх прапанову, Мікалаеўна? — голас у старшыні даўно прастуджаны і ад таго глухі, ледзьве чутны.

— Будаваць трэба не на год, не на пяць нават,— адмоўна пакруціла галавой Сідоранка.— На вякі!

— І я так думаю,— уздыхнуў быў Пятрэня.— Толькі за што будаваць? Ні табе праекту, ні матэрыялу — нічога.

Цэлую ноч у доме старшыні гарэла святло. А раніцай будаўнічая брыгада ўжо знаёмілася з першымі праектамі кароўніка, цялятніка, канюшні. Феня Мікалаеўна ўважліва сачыла за будаўнікамі: ці адобраць яе намер пабудаваць у вёсцы жывёлагадоўчы гарадок?

— Прыгожа на паперы! — пацвельваліся яны.

— Пацеха, дый годзе!

— І ў сне такога не бачылі, і чуць не чулі.

Але тут падаў свой голас старшыня:

— Ну, хопіць пераліваць з пустога ў парожняе. Хачу, каб кожны з вас наматаў сабе на вус: усё зробім, так, як у гэтым праекце.

Да гонару іх будзь сказана, чудзінскія будаўнікі

першымі ў раёне пачалі будаўніцтва грамадскай жывёлагадоўчай фермы. І зрабілі гэта — што праўда, то праўда — па-гаспадарску. Нават сёння, амаль праз дваццаць пяць год, гэтыя пабудовы вабяць вока сваёй трываласцю, прастатой і зручнасцю.

3

Зрэшты, вернемся ў Дзяніскавічы, дзе заначавала старшы заатэхнік земаддзела. Змітрок Трафімавіч дарэмна ціхенька злазіў з печы, на дыбачках хадзіў па хаце, перашэптваючыся з жонкай,— Феня Мікалаеўна даўно прачнулася і цяпер зноў думала аб кармах, так неабходных для калгаснага статка. Дзе ўзяць іх? Дзе выйсце? Хоць і кароў тых крыху больш за паўсотню, але ж паспрабуй пракармі, калі сена засталося адно на пару тыдняў. Як толькі крыху ўднела, яны выйшлі з хаты — Глеб і Сідоранка.

Завіруха ўгаманілася яшчэ ноччу, і цяпер на вуліцы ўпоравень з дахамі ляжалі вялізныя сумёты. Феня Мікалаеўна ледзьве паспявала за старшынёй. У салдацкія — не па назе — чаравікі адразу ж насыпалася снегу, пачыналі дранцвець ногі, але яна не зважала на гэта. Глеб ішоў не па гадах лёгка, з падскокам, як падлетак. Яго лапці з раменнымі аборамі амаль зусім не правальваліся ў снег. Сярод вёскі ён спыніўся:

— Дзе людзей будзем збіраць? — спытаў.— Мо ў сельсавеце?

— Можна і ў сельсавеце.

Яны падыходзілі ўжо да прыземістай, замеценай снегам хаціны, як раптам недзе на краю вёскі весела, як запознены цецярук-такавік, залапатаў матор: «Тра-та-та-та...» І змоўк. Глеб спыніўся як укопаны. Матор запрацаваў зноў, цяпер ужо больш упэўненей, гучней.

— Завялі-і-і! — што моцы закрычаў старшыня, па-дзіцячы падскочыў і праваліўся ў снег вышэй кален.— Завялі! Ура-а!

Сідоранка і раней ведала, што ў першыя дні вайны двое дзяніскаўцаў, Сяргей Цыган і Дзмітрый Зялёнка, разабралі і схавалі ад фашыстаў калгасны трактар. Пасля вызвалення яго адкапалі, але ніяк не могуць даць рады — не працуе матор. Чаго толькі не рабілі вяскоўцы з гэтай машынай: чысцілі, мылі ў салярцы, на сабе валачылі па вуліцы — усё дарэмна. І вось нарэшце машыну завялі.

— Хадзем туды,— мітусіўся Глеб.— Хутчэй. Цяпер там усе будуць.

І сапраўды, праз колькі часу да гумна, дзе грукацеў трактар, збеглася ўся вёска. Гэта была не проста радасць. Не, гэта было нешта большае. Рокат матора заглушаў людскія галасы, але па ўсмешках, па ўзмахах рук калгаснікаў можна было здагадацца, аб чым яны гаварылі.

— Глушы! — крычаў Глеб.— Глушы матор! Перагрэеш...

Яго паслухаліся. Адразу стала шумна, як на кірмашы. Жанкі абступілі Феню Мікалаеўну. Адна з іх расказвала, што яе сын хоча быць трактарыстам, другая скардзілася на сваіх дзяцей, бо тыя ўвосень адмовіліся пасвіць каровы і пайшлі ў школу, а цяпер нават мараць падавацца ў тэхнікум, трэцяя дапытвалася, ці праўда гэта, што і яе Алеська можа стаць лётчыцай. Сідоранка адказвала на пытанні, згадвала пра сваё жыццё. Жанчыны не зусім разумелі, што гэта такое рабфак, дзе ў Буда-Кашалёве вучылася іх субяседніца, і ўжо зусім сур'ёзна хапаліся за галовы, калі даведаліся, што, каб стаць ветэрынарным урачом, трэба вучыцца цэлых пятнаццаць гадоў.

— У мяне б цярпення не хапіла,— абазваўся стары дзядок, які стаяў побач.

— Ні ў каго з нашых не хопіць,— згадзілася пісклявая жанчына.

Але Сідоранка запярэчыла ім:

— Няпраўда. Будуць і ў вас свае трактарысты, урачы, настаўнікі. Нават вучоныя...

— Хі-і-і, вучоныя,— засмяялася тая ж пісклявая жанчына.— Нам, каб толькі хлеба ўволю...

— Будзе і хлеба, і да хлеба... Як гэта кажуць: угноенай зямлі — зерне, а яна табе сто верне. Іншая справа, чым угноіць яе, глебу. Вунь кармоў у калгасе няма. Значыць, не будзе не толькі малака, але і гною. Прашу вас усіх, таварышы,— закончыла Феня Мікалаеўна,— дапамажыце калгасу. Больш нам няма дзе ўзяць кармоў.

— Свая кароўка на вяроўках,— першай адгукнулася пісклявая жанчына. І нечакана змоўкла, бо ў напружанай цішыні, што ўсталявалася наўкола, словы дзядка прагучэлі асабліва выразна, хоць сказаў ён іх хуценька, як адсек:

— На вяроўцы, кажаш? Прывяжы на ланцуг, а то як выскачыць, дык усе платы па вёсцы разверне.

Будзь ты благаславенна ў час сказанае слова! Слабага ты робіш дужым, сквапнага — шчодрым, абыякавага — зацікаўленым, самага палахлівага — смелым. Слова, гэта ты зрабіла чалавека тым, чым ён ёсць.

Праз гул галасоў, добразычлівых і жартоўных, а зрэдку насмешлівых і з'едлівых, пісклявай прыйшлося цяпер доўга прабівацца, каб яе пачулі:

— А што я такое сказала... Хіба я супраць... Як усе, так і я...

Апоўдні ў бок калгаснай фермы рушылі сотні людзей — Зялёнкі, Карпені, Рулінскія, Кляўчэні, Пішчы, Цяганы, Сасікайлы, Сташаніны. На конях было немагчыма праехаць — так замяло дарогу, і таму сена, трушанку везлі на саначках, неслі ў рэзгінах.

Старшыня ж усё яшчэ сноўдаўся вакол гумна, дзе вуркацеў трактар. «З чым параўнаць цябе, сённяшні дзень?» — думаў Глеб і, не знайшоўшы параўнання, загаварыў уголас:

— Хачу, каб нашчадкі нашы ўспомнілі гэты дзень. Усіх нас успомнілі. Не бяда, што быў я ў лапцях... Ім і ў голаў нікому не прыйдзе, што раменныя аборы былі толькі ў мяне. У аднаго. На ўсю вёску.

А Сідоранка ў гэты час вярталася ў Ганцавічы. «Прыгожыя людзі,— падумала яна.— Сціплыя і свядомыя. З такімі можна горы зрушыць».

4

Так павялося, відаць, здаўна: год на год ніколі не прыходзіўся. Былі і ўраджаі, быў і недарод. Іншым разам арцельныя статкі раслі і тлусцелі, як на дражджах, ды раптам убівалася якая-небудзь хвароба — касіла без разбору і кволы маладняк і гадавалую жывёлу.

Але ж лёгка сказаць: «касіла без разбору». Лёгка, урэшце рэшт, скласці акт, спісаць прапаўшую скаціну. Куды цяжэй выгадаваць яе, уберагчы ад хваробы. У жывёлы не спытаеш, дзе і што баліць. Яна не скажа. Хочаш выгадаваць — не спускай вачэй.

І таму ў райземаддзеле работа ніколі не пераводзілася. Ні зімой, ні ўлетку. Сама назва гэтай надзвычай важнай установы ў хуткім часе змянілася, але ж профіль работы заставаўся ранейшым. Галоўны ветэрынарны ўрач і цяпер дзень у дзень прападала на фермах.

Кожны вясковы жыхар ведае, якіх намаганняў каштуе, скажам, узбіцца на карову. Калгасы ж абзаводзіліся статкамі, многімі сотнямі кароў. Да таго ж разводзілі авечак і свіней.

...Сутонела. У Малыя Круговічы Феня Мікалаеўна прыехала спадарожнай аўтамашынай і хутка адшукала старшыню Мікалая Берната. Калі выйшлі на вуліцу, зусім сцямнела. Браўся мароз.

— Я адразу казаў, што нічога не выйдзе ў нас з гэтай самай свінафермы,— парушыў быў маўчанне старшыня.— Цяпер гінуць парасяты, як мухі ўвосень.

Сідоранка не адказала. Тады старшыня забубніў сабе пад нос:

— Усе думаюць, бытта раней тут адны дзівакі жылі. Не вядуцца ў нас свінні. Наўкола патапеча такая, сырасць. Гэта яно толькі здаецца, што свінні гразь любяць...

Зайшлі ў хісткую будыніну-развалюху, прыстасаваную пад свінарнік.

— Лена! — паклікаў старшыня ў цемру.— Падгайская, дзе ты корпаешся тутака?

— Нямашака яе,— высунуўся з-за вугла вартаўнік.— Парасяты дамоў панесла. На печ панесла. Акалеюць жа да раніцы ў такой халадэчы.

У хаце Падгайскай чамусьці было поўна людзей. Яны аб нечым ажыўлена гаварылі, а калі зайшлі Сідоранка і Бернат, змоўклі ўсе разам, як згаварыліся ўсё роўна.

— Дык што, кажаце, не вядуцца ў вас свінні? — Сідоранка стала сярод хаты.

— Гэта як у каго,— нясмела пачаў быў нехта ў парозе і ўжо больш рашуча працягваў: — У нашага старшыні яны спрадвек не вяліся. Колькі помню, заўсягды ў Бернатаў была нішчымніца.

— Ага, зноў Бернат вінаваты,— аж падскочыў старшыня.— Стань на маё месца, калі разумнік гэтакі, і зрабі лепш за мяне, а тады плявузгай.

— Ты не кіпяціся, Мікола,— не здаваўся ў парозе ўсё той жа голас.— Я на тваім месцы абмазгаваў

бы ўсё як след і, можа, сам адказаўся б ад гэтай пасады. Раз не можаш, тады злазь з даху і, як кажуць, не псуй гонты...

Пасля гаварылі ўсе разам і цяжка было разабраць, хто і што хацеў сказаць. Але галоўнае Феня Мікалаеўна ўлавіла: людзям патрэбен важак — празорлівы, рашучы і гаспадарлівы. І не толькі на чале калгаса. На фермах, у брыгадах, звеннях — скрозь. Такі, каб яму людзі верылі, каб на яго спадзяваліся не менш, чым на сябе. А паверыўшы, чалавек даможацца ўсяго, што ні пажадае.

Аб гэтым і расказвала яна назаўтра Кірылу Васільевічу Арцёменку, сакратару райкома. У кабінеце сакратара сядзелі раённы ўпаўнаважаны міністэрства нарыхтовак Якаў Гарасімавіч Сцежыц, першы сакратар райкома камсамола Васіль Іванавіч Аркесаў і інструктар райкома Карп Барысавіч Іванцоў. Усе яны былі нейкія ўрачыстыя, аж свяціліся. Ды і сам сакратар быў незвычайна ўзрушаны, здавалася, зусім не слухаў субяседніцу.

— Важакі, гаворыш, Мікалаеўна, патрэбны? — узняўся Арцёменка з-за стала.— А чым мы не важакі?

І паказаў рукою на прысутных, а пасля — на сябе.

— Я сур'ёзна, Кірыла Васільевіч. А вы...— сумелася Сідоранка.

— А я таксама сур'ёзна... Мы рашылі прасіць пленум райкома, каб нас рэкамендавалі на работу ў калгасы...

Не сказаць, каб яна разгубілася ці не паверыла. Ім яна верыла заўжды, ведала кожнага не першы год. Гэта былі тыя людзі, што не кідаюць слоў на вецер, як скажуць — жалезна, прымуцца за штэкольвечы — не адступяцца, пакуль не даб'юцца свайго. Менавіта ў гэтую хвіліну ёй захацелася заў-

сёды быць побач з імі, і таму спытала, коратка і дзелавіта:

— А мне з вамі — можна?

— Нізашто! — не то жартам, не то ўсур'ёз за ўсіх адказаў Сцешыц.— Хто ж нам тады памагаць будзе...

І ўсе рассмяяліся.

5

З гадамі змяняецца ўсё — і зямля, і людзі. Людзі растуць, старэюць, а зямля маладзее. Гэта ж калі тое было, як учора ўсё роўна: адразу ж за Ганцавічамі буяў непралазны хмыз, паабапал дарогі ён тапырыўся пругкім разгатым голлем, дарога, вузкая і пясчаная, здавалася ў гэтым хмызу нізкай, нібыта бегла яна па дну вузенькага раўка, шэрага зімой і зялёнага ўлетку.

Цяпер наўсцяж дарогі, як скінуць вокам, палі і пашы. Палі ўрадлівыя, жыты растуць, як чараты, пашы траўлівыя, з такой ядкай травою, што статак не швэндаецца па іх, як непрыкаяны, а стаіць, як спутаны. І пастухам ніякавата: быццам паставілі іх тут для прыліку. І дарога не тая, высокая шаша-камяніца прастуе паўз дзялянкі асушаных тарфянікаў, драбналессем, новымі вясковымі вуліцамі, а за Шашкамі, аж да самых Вялікіх Кругавіч, віхляе ў дзівосным тунелі ліпняку — стромкага і купчастага, прыгожага ва ўсе поры года.

Феня Мікалаеўна даўно прывыкла да цяперашняй новай дарогі. Вось зараз камяніца схаваецца за кашлатымі хвоямі Кругавіцкага лесу, там, за повараткай, саступіць месца гравійцы такой жа высокай, ладна наезджанай, і праз колькі часу порсткі «газік» выскачыць на дзяніскавіцкае поле, а там навідавоку Дзяніскавічы. Яе сёння чакаюць у гэтым калгасе,

вельмі ж прасілі прыехать. «Хваліцца будуць... Такі жывёлагадоўчы комплекс адгрохалі. Махіна! На дзве тысячы галоў... На маёй памяці калгасны статак вырас у сорак разоў...»

Нейкі час яна сіліцца ўгадаць, як абставіць адкрыццё комплексу старшыня калгаса Аляксандр Васільевіч Зялёнка. «Круціцца будзе, як ваўчок. Накіне наапашкі пінжак і не сцішыцца, не пастаіць нішкам, а будзе дакараць каму заўгодна: «Ну, што скажаш, га? Хто сказаў, што лапці ваду прапускаюць!» І засмяецца задаволены. Потым, пэўна, і ёй дасць слова. А што яна скажа? Пару слоў, не болей: «Дзякуй вам, людзі. За ўсё дзякуй!»

Яна так і сказала, калі нарэшце змоўклі воплескі, якімі вяскоўцы сустрэлі яе прозвішча.

— ...За ўсё дзякуй! І за рукі вашы залатыя, і за сэрцы добрыя, чалавечыя.— Яна трошкі памаўчала, бо зноў грымнулі апладысменты.— І за сена, за струшанку тую дзякуй, што некалі мы са Змітраком Трафімавічам прасілі ў вас. Ці помніце вы гэта?

— Як жа не помніць! — загулі з усіх бакоў, заўсміхаліся калгаснікі.— Такое не забываецца.

Яна не любіць выступаць, і гэта ўсе ведаюць. Яна проста размаўляе з людзьмі. Па-жаночаму шчыра, неяк так лагодна, даходліва, што не слухаць яе немагчыма. Гэтая лагоднасць заварожвае людзей. І яны загаманілі:

— А ці помніш, Мікалаеўна, як ты казала, што і ў нас будуць свае вучоныя? Помніш?

— Дзіва што помню.

— Угадала.

— Няўжо?

— Усё спраўдзілася, чын-чынаром.— І — да старшыні: — Раскажы, Васільевіч, кім сталі нашы хлопцы.

Старшыня рады пахваліцца землякамі:

— Сцяпана Рулінскага ведаеце?.. Ну, конюхам некалі ў нас рабіў. Дык сын яго, Іван, цяпер загадвае кафедрай у Горацкай акадэміі, кандыдат сельскагаспадарчых навук. А Кляўчэневы хлопцы ў Мінску працуюць... Сцяпана Кляўчэню вы павінны ведаць: у яго сям'я ў актывістах была — напорыстая такая, дружная. Старэйшы сын Ляксей — кандыдат філасофскіх навук, у нашым Беларускім універсітэце выкладае, а малодшы, Мішка,— кандыдат педагагічных навук, у Мінскім інстытуце імя Горкага працуе... Цяпер ва ўсіх вузах поўна нашых людзей. На свята як з'едуцца, дык па вуліцы не прайсці. Найбольш машынамі, а некаторыя матацыкламі, матаролерамі прыязджаюць.

— Н-у-у, расхваліўся,— жартуе Сідоранка.— А касманаўта ўсё-такі няма пакуль што.

— Будзе! Абавязкова будзе! — зноў ажыўляецца старшыня і хітравата прыжмурвае вочы.— А хто сказаў, што лапці ваду прапускаюць?

6

Паўвека — поўдзень чалавечага жыцця. З яго вышыні асабліва выразна бачны ўсе пяцьдзесят перагонаў жыццёвай дарогі. І як прыемна, калі ўся яна была без прывалаў, праходзіла не ў зацішку, не па задворках чалавечых лёсаў, а ў гушчыні жыцця, на яго вірлівай быстрыні, сярод людзей сваіх, якім ты быў патрэбен кожны дзень, нават кожную хвіліну. У гэтым, мабыць, і заключаецца вышэйшае прызначэнне чалавека, яго сапраўднае шчасце.

Зусім нядаўна адзначыла сваё пяцідзесяцігоддзе галоўны ветэрынарны ўрач Ганцавіцкага ўпраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкома, заслужаны ветэрынарны ўрач Беларускай ССР Феадосія Мікалаеўна Сідоранка. Неяк так здарылася, што дзявочае яе

імя Феня, простае і пяшчотнае, неўпрыкмет так трывала замацавалася за ёй, што многія нават здзівіліся, чаму гэта ва Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга яе называюць Феадосіяй Мікалаеўнай. Дзіўна неяк з непрывычкі.

Што і гаварыць, у дзень імянін незапрошанаму чалавеку няёмка заходзіць да юбіляра. Кожны здагадваецца, што рыхтуюцца там да сустрэчы гасцей. Навошта ж напрошвацца, клопату прыбаўляць людзям? І таму звычайна віншуюць тэлефонам, тэлеграмай ці проста віншавальнымі паштоўкамі.

Павіншаваць Феню Мікалаеўну прыходзілі і прыязджалі з усіх вёсак раёна. Былі, канечне, тэлеграмы, тэлефонныя званкі, паштоўкі. Але найбольш было поціскаў рук, шчырых і сардэчных слоў, кветак — гэтага спрадвечнага выражэння людской любові і ўдзячнасці.

Асабліва завіхаліся пажылыя людзі — ветэраны калгаснага будаўніцтва. З гэтымі цягацца не выпадае: іх жыццёвая прадбачлівасць заўсёды бярэ верх. Так атрымалася і на гэты раз. Сышліся госці, азіраюцца: няма ветэранаў. А тыя каля пошты дзяжураць. Трохі спагадзя прыходзяць з цэлым пукам газет. А ў газетах і віншаванне юбіляру, і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі аб узнагароджанні Ганаровай Граматай.

За сталом, як і водзіцца сярод людзей, згадалі ўсё — і нягоды, і радасці. Часцей, праўда, успаміналі першыя пасляваенныя гады, калі цэлымі суткамі без сна і адпачынку ваявалі з бруцэлёзам, шаленствам, каростай, нават чумой і афрыканскім сапам. (Якой толькі поскудзі не пакінула тут пасля сябе вайна!) Успомнілі рознае. Успаміналі ўсе.

«А памятаеш:

— як абнасіліся і пайшлі к Башкатаву, старшы-

ні райспажыўсаюза, прасіць напавер валёнкі — зарплату тады нешта месяцы тры запар не выдавалі;

— як паўдня хадзілі па падваконню, прасілі людзей ісці на работу ў калгас, а потым самі трапалі лён, садзілі бульбу;

— як Валодзя Канановіч даў драла з калгаса, а калі вярнуўся, дык круціўся, што голы ў крапіве;

— як Івана Чыркуна напалохалі, што ў ягонай жонкі ногі няпарныя: адна — правая, а другая — левая».

Успаміны... Успаміны...

...Госці разыходзіліся далёка за поўнач. Васіль Пятровіч (цяпер муж Фені Мікалаеўны — загадчык райана, заслужаны настаўнік Беларускай ССР) праводзіў іх, крышачку больш звычайнага гаманлівых, за веснічкі. А калі ён вярнуўся ў сваю невялічкую двухпакаёвую кватэру, ў ёй было чыста, прыбрана, быццам тут з хвіліны на хвіліну чакалі важнага госця. Здзівіўся: гэта ж так было заўсёды, а вось прыкмеціў толькі цяпер.

Як хораша, калі ў дарагім для цябе чалавеку зноў і зноў адкрываеш нешта новае, ад чаго, як у юнацтве, страпянецца сэрца ў грудзях і пасвятлее нават самы высокі поўдзень.